# Пасашок у дарогу

## Слова пра настаўніка

***У мяне часта пытаюць, як я стаў кампазітарам. Пытанне складанае, але можна сказаць і коратка: я цалкам абавязаны свайму першаму музычнаму настаўніку Яўгену Петрашэвічу.***

У маленстве я вельмі любіў спяваць і з гатоўнасцю, ускараскаўшыся на табурэтку, даваў канцэрты для дарослых па ўсёй бліжэйшай акрузе. Тады я адчуў асалоду першага артыстычнага поспеху, але хутка зразумеў падвох – маіх слухачоў забаўляла, як я, малы, старанна капіяваў «дарослыя» пачуцці. У школе я ўжо стараўся не спяваць без патрэбы. І наогул, урокі спеваў мне вельмі не падабаліся. А на дзясятым годзе мой бацька (які сам у дзяцінстве хацеў іграць на скрыпцы) вырашыў заняць мяне карыснай справай. Толькі ж прыёмныя іспыты ў адзінай дзіцячай музычнай школе ўжо закончыліся. Але ў тым Гродне тутэйшыя людзі добра ведалі адно аднаго, і бацька дамовіўся аб прыватнай сустрэчы з вядомым скрыпачом і дырэктарам музычнай школы Мікалаем Гільдзюком. Я адважна праспяваў для яго «Ревела буря, гром гремел…». Пахваліўшы мяне, Мікалай Георгіевіч пацікавіўся ўзростам. Мне было 10. Прысуд быў катэгарычны – пачынаць кар'еру скрыпача позна. Але зазначыў, што з такімі здольнасцямі трэба заняцца музыкай.

Памятаю, як з бацькам першы раз пераступіў парог таямнічага будынка музычнай школы. У класе нас сустрэў высокі, хударлявы малады чалавек з вельмі выразнымі вачыма і з шавялюрай мастака ці дырыжора. Пазнаёміліся, і я пачуў, як бацька сказаў: «Аддаю табе сына. Навучы яго таму, што сам умееш». А настаўнік ужо ўмеў многае, яшчэ больш ведаў і хацеў зведаць! Засмучала толькі, што я, напэўна, «лішні» ў класе, бо мяне прынялі ў школу як бы дадаткова. Што ж, падумаў, я дакажу, што вы не памыліліся.

Навука пачыналася з самага малога: з выхавання ў агульным сэнсе гэтага слова. Гэта былі як бы ўводзіны ў храм мастацтва. Настаўнік строга сачыў за паводзінамі ў школе, патрабаваў, каб вопратка і абутак былі чыстымі, вучыў з павагай ставіцца да музычных інструментаў, прывучаў да акуратнасці ва ўсіх праявах.

Баян спачатку не хацеў не толькі іграць, але нават трымацца на каленях, пальцы не слухаліся. Але ўжо праз пару месяцаў настаўнік садзіўся за фартэпіяна, нешта дадаваў ад сябе, і нечакана атрымлівалася цудоўная музыка! Так я першы раз мімаволі далучыўся да таямнічага працэсу стварэння музыкі. Пазней даводзілася і спяваць, каб навучыцца правільнай музычнай фразіроўцы, і танчыць, каб адчуць асаблівасці рытму старадаўняга танца або характару персанажа. Так незаўважна і нязмушана мы ўцягваліся ў асаблівы свет артыстычнай гульні, вучыліся правілам сяброўскіх мастацкіх стасункаў. З вялікай радасцю я іграў на балалайцы-секундзе ў народным аркестры, якім кіраваў настаўнік. Бачыў, што партытуры ён піша сам. І гэта была яшчэ адна таямніца, якая прыцягвала і забаўлівала мяне да музычных заняткаў. Але праз два гады Яўген Канстанцінавіч паехаў у Мінск. Усе ганарыліся, што ён будзе вучыцца на аддзяленні кампазіцыі.

Новы настаўнік быў інакшы. Ён шчыра выконваў свой абавязак – вучыў іграць на баяне, а мне зусім не хацелася іграць, як кажуць, «хутчэй і грамчэй». Аркестра не стала, у класе больш не імправізавалі. Заняткі музыкай страцілі для мяне прывабнасць. А самае галоўнае адрозненне было ў тым, што Яўген Канстанцінавіч, патрабуючы павагі да сябе, заўсёды паважліва ставіўся да вучняў. У той год я вырашыў, што з музыкай для мяне ўсё скончана. Але нечакана праз год Яўген Канстанцінавіч вярнуўся.



*Я. Петрашэвіч*

Узнавіліся заняткі *музыкай*. Яўген Канстанцінавіч паказваў нам свае новыя песні, якія цудоўна спявалі яго маці і сястра. Памятаю да гэтай пары ў іх выкананні «Нарачанскія сосны», «Калыханку». Па радыё часта гучала яго бадзёрае «Інтэрмецца» для кларнета і эстраднага аркестра. Я скончыў музычную школу і паступіў у Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча. Але нашыя сустрэчы працягваліся. Я іграў у ягоным аркестры народнага ансамбля песні і танца. Там змог сачыць за ўсім творчым працэсам. Пры мне стваралася лепшая, як мне здаецца і сёння, вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Залатыя каласы» з цудоўнай харэаграфіяй Ларысы Ляшэнка. Потым пастаноўка была перанесеная ў Дзяржаўны народны хор.

Для Яўгена Канстанцінавіча быў зорны час. Гэта быў старанна прадуманы і падрыхтаваны адказ сапраўднага народнага таленту на ганенні, правакацыі, здзеклівыя ўхмылкі, сатысфакцыя за крыўду і несправядлівасць.

У музычнай школе я быў яшчэ занадта малы, каб адчуць, якія псіхалагічныя перамены адбыліся ў любімым настаўніку за год яго адсутнасці… Паляцеўшы з правінцыйнага Гродна ў вольны, як яму здавалася, свет, ён апынуўся ў цеснай клетцы савецкай навучальнай установы. Татальны ідэалагічны кантроль адчувалі на сабе і педагогі, і студэнты. Расчараваны ў сваіх надзеях здабыць вольны абшар для музычнай творчасці, Яўген Канстанцінавіч рашуча парваў стасункі з сістэмай. Цяпер ён з юнацкім максімалізмам пачаў пазбягаць у мастацтве і жыцці ўсяго, што навязвалася яму і ўсяму грамадству звонку, адкуль бы тое ні зыходзіла. Ён цураецца і афіцыйнага мастацтва, і эксперыментаў як савецкіх кампазітараў, так і заходніх авангардыстаў. Трэба шукаць сваё, адметнае.

Вяртанне на радзіму стала для яго пачаткам вяртання да сваіх каранёў, да сваёй сапраўднай існасці. Свой духоўны паратунак і паратунак моладзі бачыць толькі ў вяртанні да мудрасці продкаў, да традыцыйных каштоўнасцяў. Не маючы падтрымкі і аднадумцаў, распачынае асабістую вайну з абыякавасцю, шэрасцю, пошласцю, нацыянальным нігілізмам. Ён неабачліва не хаваў сваіх поглядаў… Вольнымі паводзінамі нажываў сабе нядобразычлівцаў сярод зайздросных калегаў і чынавенства. На ўсялякі выпадак адлучылі яго ад выхавання «новага пакалення будаўнікоў камунізму». Я. Петрашэвіч пайшоў да аматарскіх мастацкіх калектываў Гродзеншчыны.

У музычным вучылішчы я не вызначыўся з будучай прафесіяй. Камусьці прыйшла думка, што я ўпотай пішу музыку, і сказаў аб гэтым старшыні Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі кампазітару Эдзі Тырманд. За тры дні, пакуль ішлі дзяржаўныя іспыты, я напісаў дзве інструментальныя п'есы, якія ёй паказаў. Нечакана для сябе атрымаў рэкамендацыю павучыцца на кампазітарскім аддзяленні. З гэтай навіною прыйшоў да Яўгена Канстанцінавіча. Ён паставіўся да прапановы вельмі стрымана, з недаверам. А з іншага боку, – чаму б вучню не ўзяць рэванш за крыўду настаўніка?

На падрыхтоўчым аддзяленні я пачынаў з нуля. Яўген Канстанцінавіч мяне падбадзёрваў і падтрымліваў. Я са здзіўленнем пачаў усведамляць, што ***кампазітарам я стаў раней, чым пачаў пісаць музыку***. Увесь час, пакуль слухаў, назіраў за працай, мімаволі сачыў за жыццём свайго настаўніка, у ва мне ішло фармаванне адмысловага тыпу творчай натуры. Гэтае маё другое «я» пастаянна штурхала мяне на свавольныя ўчынкі. Цяпер і Яўген Канстанцінавіч заўважыў хібы майго стыхійнага кампазітарскага выхавання і, з улікам свайго жыццёвага досведу, перасцерагаў мяне ад памылак.

Хоць жылі мы ўжо далёка адзін ад аднаго, сувязі нашыя былі вельмі моцныя. Яўген Канстанцінавіч даўно стаў сваім чалавекам для ўсёй маёй радні. Без яго не абыходзілася ні адно сямейнае свята. Па-ранейшаму ён быў для мяне самым галоўным аўтарытэтам. Яго трапныя заўвагі заўсёды здзіўлялі мяне нечаканасцю і парадаксальнасцю.

Гутарка з Яўгенам Канстанцінавічам увесь час патрабавала напружанай працы розуму. Яго мова была насычанай паэтычнымі параўнаннямі, метафарамі, часта аздаблялася народнымі прымаўкамі, прыказкамі, жартамі. Часам з ім можна было пасправачацца, але безвынікова. Напрыканцы ён як быццам і пагодзіцца з табою, але кропку паставіць яго сакраментальнае: «Так то яно так. Але, як *той* казаў…».

Як бы то ні было, а кампазітарам я стаў дзякуючы незвычайнаму педагагічнаму таленту і чалавечай тактоўнасці Яўгена Канстанцінавіча. Ён не вучыў мяне рамяству кампазітара – гэта рабілі Анатоль Багатыроў, Уладзімір Алоўнікаў, Альберт Леман і іншыя педагогі ў беларускай і маскоўскай кансерваторыях. Майстэрства я ўдасканальваў ужо самастойна, калі вывучаў творы класікаў. Я ўдзячны першаму настаўніку за тое, што ўвёў мяне ў дзіўны, таямнічы, схаваны ад старонніх вока свет мастацтва, і даў мне ў рукі пасашок на дальнюю дарогу. Той нябачны пасашок, відаць, і стаў пропускам у прафесію кампазітара.

*Віктар ВОЙЦІК, кампазітар*

### Даведка

**Яўген Канстанцінавіч ПЕТРАШЭВІЧ** нарадзіўся 18 чэрвеня 1930 г. у вёсцы Падбараны Мастоўскага раёна.

Настаўнік музыкі, закончыў Мінскую музычную вучэльню (1955). Акампаніятар Беларускай дзяржаўнай эстрады (1955 – 1956); выкладчык Гродзенскай музычнай школы па класе баяна, цымбалаў, народных інструментаў, кампазіцыі (1956 – 1970); кіраўнік аркестравай групы народнага ансамбля песні і танца «Нёман» г. Гродна (1976 – 1981); кіраўнік аркестра народных інструментаў Гродзенскага абласнога палаца піянераў і школьнікаў (1981 – 1990); кіраўнік фальклорнага ўзорнага ансамбля «Гарадзенскія дударыкі» (1990 – 2002).

Я. Петрашэвіч з'яўляецца сябрам Гродзенскага клуба кампазітараў-аматараў. Аўтар вакальна-харэаграфічных кампазіцыяў і песень.

Узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1995), Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры СССР і БССР (1964), Вярхоўнага Савета БССР (1965) і іншымі ўзнагародамі. Дыпламант 6-га Міжнароднага фестывалю народнай музыкі. Узнагароджаны Дыпломам абласнога конкурсу кампазітараў-аматараў Гродзеншчыны за цыкл песень-баладаў гістарычнай тэматыкі на вершы Яна Чачота.